Конкурс «Мы ў адказе за Перамогу»

Эсэ

**«Мае землякі не былі ў старане»**

**(Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі майго краю)**

Вялікая Айчынная вайна – самая страшная падзея ў гісторыі Беларусі, і менавіта гэтым вызначаецца яе важнасць не толькі для тых, хто ваяваў, але і для тых, хто нарадзіўся ў мірны час. І таму 75-годдзе Вялікай Перамогі я і мае блізкія будзем адзначаць разам з усёй краінай.

У горадзе-героі Мінску дзень вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў запомніцца велічным парадам, ганаровым шэсцем ветэранаў і прадстаўнікоў Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь, дэманстрацыяй легендарнай ваеннай тэхнікі. А ўвечары Дзень Перамогі прагрыміць залпамі святочнага салюту.

А на маёй малой радзіме – аграгарадку Пясочнае, што ў Капылькім раёне, – раніцай 9 мая ля мемарыяльнага комплекса ціха збяруцца жыхары з букетамі чырвоных цюльпанаў. Тут, у засені ліп і клёнаў, размешчана некалькі брацкіх магіл партызан і чырвонаармейцаў, помнік “Смуткуючая маці” і мемарыяльныя пліты з імёнамі загінуўшых воінаў і мірных жыхароў Пясочнага. Гэта ім прысвяціў Адам Русак свой верш “Пясоцкім партызанам”.



Іх на плошчы сяла пахавалі
Каля хат і шумлівых садоў,
На магілы ім кветкі саджалі,
Што прыносілі з родных палёў.

Мітынг, прысвечаны юбілейнаму Дню Перамогі, пачнецца з малітвы аб супакаенні душаў загінуўшых і вечнай памяці герояў вайны і яе пакутнікаў. Пасля гэтага скажуць свае набалелыя словы дзеці, ўнукі і праўнукі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. “Чаму

дзеці, ўнукі і праўнукі?” – спытаеце вы. А таму, што апошні герой – ветэран Падолін Канстанцін Пятровіч – пакінуў гэты свет некалькі гадоў таму. І пацякуць успаміны выступаючых, словы болю, жалю, пракляцця вайне, словы веры і надзеі, словы любові да Радзімы. Сапраўды, дзе, як не тут, ля брацкай магілы, гаварыць аб патрыятызме, аб адзінстве народа, аб святым абавязку – абароне Радзімы?

Далёка не ўсе маладыя людзі разумеюць, што патрыятызм – гэта паняцце намнога глыбейшае, чым гучныя словы “люблю Беларусь”. Патрыятызм – гэта перш за ўсё клопат пра свой край і краіну. І абарона Айчыны павінна быць справай кожнага чалавека.  Абараняе яе той, хто стаіць на стражы парадку, хто змагаецца з карупцыяй і бандытызмам, хто выратоўвае жыцці на пажарах, ў іншых надзвычайных сітуацыях. Гэта і ўрачы, што, рызыкуючы сваім здароўем, самаахвярна змагаюцца з эпідэміяй. Гэта і працаўнікі палёў, што вядуць бітву за ўраджай.

Але сапраўдная мужнасць – гэта мужнасць вайсковая, ратная. Мужнасць біць акупантаў пад кулямі і снарадамі. Мужнасць супрацьстаяць фашысцкай навале. Мужнасць не скарыцца ворагу пад прыцэлам аўтамата. Хоць страшна, жудасна, але не здацца. Выканаць загад любой цаной…

Вялікая Перамога складалася з намаганняў усіх сыноў і дачок нашай Радзімы. Найбольш цяжкія, жахлівыя старонкі біяграфіі Пясочнага прыпадаюць на гады Вялікай Айчыннай вайны. Ужо ў 1942 годзе ўсе мужчыны, хто мог насіць зброю, ваявалі ў партызанскіх атрадах і на фронце. Насельніцтва дапамагала партызанам ежай, адзеннем, абуткам. Пясочнае тады называлі партызанскай Масквой. Наш зямляк Анатоль Астрэйка ў 1945 годзе з гонарам напісаў:

За ўсё-ж даражэй мне адданасць народа.
Ніхто нас за справы нічым не ўпікне.
Ад бітваў крывавых, ад слаўных паходаў
Мае землякі не былі ў старане.

Фашысты не раз ўчынялі крывавыя расправы над мірнымі жыхарамі: здзекваліся з яўрэяў (у Пясочным было гета), выслежвалі партызанскія сем’і і распраўляліся з імі.

5 студзеня 1943 г. ў Пясочнае прыехаў карны атрад. Фашысты спачатку атачылі ўсю вёску, затым пачалі зганяць на школьны двор людзей, члены сям’яў якіх былі ў партызанах або якія мелі сувязь з партызанамі. У адным з класных памяшканняў школы паставілі кулямёт. Людзей расстрэльвалі... Пасля ад’езду карнікаў жыхары Пясочнага кінуліся да месца расстрэлу. Здавалася, што ўся вёска патанула ў крыку, стогне і плачы. У той дзень было расстраляна 30 дарослых і 13 дзяцей.

20 верасня 1943 года і 11 мая 1944 года Пясочнае падверглася нямецкім бамбардзіроўкам. Вясной 1944 года песачанцы заставаліся ў вёсцы толькі ў пахмурныя дні. У ясныя дні амаль усе ішлі ў бліжэйшыя лясы, дзе былі пабудаваны сховішчы.

Летам 1943 г. па сутнасці ўвесь раён кантраляваўся партызанамі. Ім дапамагала мясцовае насельніцтва. На тэрыторыі Капыльшчыны на гэты час у асноўным дзейнічала брыгада імя Чапаева. Праўда, рабілі налёты на варожыя гарнізоны, арганізоўвалі засады на дарогах байцы і з іншых партызанскіх брыгад, якія размяшчаліся паблізу.

Песачанцы аказвалі матэрыяльную дапамогу партызанам. Менавіта пастаянныя кантакты з насельніцтвам, умела прадуманая агітацыйная работа дапамагала партызанам паспяхова граміць ворага.

Ля помніка “Смуткуючая маці”, на мемарыяных плітах – імёны 182-х чалавек, загінуўшых на фронце і на акупіраванай тэрыторыі. На брацкіх могілках пахованы 12 партызанаў 300-й брыгады імя Варашылава, 27-й брыгады імя Чапаева і адзін чырвонаармеец. Іх маладыя сэрцы сціхлі не ў адзін дзень, а на працягу 1942-1944 гадоў, здабываючы агульную для ўсіх Перамогу.

На заданне ішлі яны смела
І жыццё за свой край аддалі,

Каб заўсёды зямля маладзела
І людзі ў шчасці жылі.



Каб людзі ў шчасці жылі… Але ці усе нашы сучаснікі ведаюць, што такое шчасце? Наша шчасце ўперадзе, толькі не трэба шукаць яго, не трэба лавіць гэту сінюю птушку. Яго трэба заслужыць яго ў стараннай працы, у здзяйсненні мараў і надзей. Шчасце – ў змаганні за шчасце ўсяго народа. Шчасце – у адданым служэнні сваёй Айчыне! І без памяці пра мінулае яго нельга здабыць.

Вечная памяць ахвярам вайны! Вечная слава яе героям!

Ігар Зайцаў, 15 гадоў, навучэнец 9 класа ДУА “Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі” Капыльскага раёна, Мінскай вобласці.